УДК 930:94(476.4)

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ВЫВУЧЭННЯ ГОРАДА БЫХАВА (ГІСТОРЫЯ, АРХЕАЛОГІЯ)

**Галынскі Р. Д.**
Аддзел ідэалагічнай работы, культуры
і па справах моладзі Быхаўскага райвыканкама
(Быхаў, Рэспубліка Беларусь)

Анатацыя. Адным з найменш вывучаных гарадоў Магілёўскага Падняпроўя з'яўляецца Быхаў. Гэты горад быў і рыцарскім замкам, і найважнейшай магнацкай рэзідэнцыяй у рэгіёне Верхняга Падняпроўя, і сталіцай Быхаўскага графства. На сённяшні дзень адсутнічаюць грунтоўныя даследаванні па гістарыяграфіі гэтага населенага пункта. У навуковай літаратуры дамінуюць невялікія сюжэты, якія ўскосна, апасродкавана тычацца гісторыі горада.

Ключавыя словы: гістарыяграфія, горад Быхаў, вывучэнне, гісторыя, археалогія, даследаванні.

Summary. One of the most explored towns of the Mogilev Dnieper region is Bykhov. This city was both a knights castle, the most important magnate residence in the Upper Dnieper region, and the capital of the Bykhov country. To date, there are no fundamental studies on the historiography of that settlement. The scientific literature is dominated by small plots that indirectly, indirectly affect the history of the city.

Key words: historiography, city of Bykhov, study, history, archeology, research.

Першыя спарадычныя звесткі па гісторыі горада былі атрыманыя краязнаўцамі і аматарамі гісторыі выключна з мясцовых легенд і паданняў, апублікаваных летапісных і іншых пісьмовых сярэднявечных крыніц. Быхаў згадвалі Г. Каніскі і М. В. Без-Карніловіч. Паведамленні па гісторыі Быхава ўтрымліваюцца ў агульнагеаграфічным і гістарычным зборніку "Топографические примечания на знатнейшие места путешествия Ея Императорского Величества в Белорусские наместничества" 1780 г. [5, с. 85; 25, с. 94, 104, 169; 46]. інфармацыя пра горад Быхаў падаецца і ў трэцім томе выдання "Живописная Россія" [18, с. 423–424]. Кампілятыўны артыкул змяшчаецца ў дзявятым томе "Полного географического описания нашего Отечества" пад аўтарствам А. Сапунова і А. Кабанава [18, с. 486–489]. Гісторыя Быхава апісана яшчэ ў першым томе "Опыта описания Могилевской губернии" А. С. Дэмбавецкага 1882 г. [32, с. 49–53].

З замежных манаграфій, у якіх згадваецца горад Быхаў, першай была кніга "Starożytna Polska pod względem historycznym, geograficznym i statystycznym opisana" аўтарства М. Балінскага, якая пабачыла свет у 1846 г. [52, с. 809–810].

У савецкі даваенны час вывучэннем горада займаліся толькі краязнаўцы. Сучасны даследчык музейнай справы на Беларусі А. А. Гужалоўскі адносіць пачатак развіцця музейнай справы на Быхаўшчыне да пачатку 20-х гг. XX ст. [19, с 64–65]. Важны ўнёсак у вывучэнне Быхава – кніга "Памяць" Быхаўскага раёна [33]. Асобна трэба разгледзіць серыю зборнікаў артыкулаў "Быховские краеведческие чтения".

Савецкія і беларускія даследчыкі распачалі вывучэнне Быхава з канца 1950-х гг. Асобныя сюжэты па гісторыі разглядаемага горада ў агульнагістарычным кантэксце развіцця Беларусі і Усходняй Еўропы закраналі ў сваіх даследаваннях Л. С. Абэцэдарскі, А. П. Грыцкевіч, А. М. Мальцаў, З. Ю. Капыскі [1; 2; 16; 29; 26].

Вывучэннем вайсковай справы, фартыфікацыі, горадабудаўніцтва і часткова збраязнаўствам займаўся М. А. Ткачоў. Ён першым у беларускай гістарыяграфіі прапанаваў сваю навуковую версію гістарычнага развіцця Быхава з моманту яго ўзнікнення і да пачатку XIX ст. на падставе вывучэння архітэктуры і пісьмовых крыніц [44–45]. У энцыклапедычных артыкулах паўтараліся высновы даследаванняў М. А. Ткачова і І. І. Сінчука. Шэраг іх высноў і меркаванняў знайшоў сваю падтрымку ў навуковых артыкулах і манаграфіях [39–40].

У агульнабеларускім гістарычным кантэксце вайсковая гісторыя Быхава згадваецца Г. Сагановічам. На сённяшні дзень асноўныя даследаванні гэтага пытання адлюстраваны ў нашых спецыялізаваных публікацыях (комплекс узбраення і рыштунку быхаўчан), М. А. Волкава (абарончыя ўмацаванні, рыштунак Быхаўскага гарнізона), М. Ю. Шкаплярова (вайсковыя падзеі ў XVII ст.) і М. Савіцкага (агляд комплексу мілітарый і рыштунку ў замку). Акрамя таго, у сваіх манаграфіях звесткі пра аблогі і



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

вайсковыя падзеі з удзелам Быхава прыводзяць К. Касажэцкі і К. Бабятынскі. Вядучым спецыялістам-збраязнаўцам па гісторыі ўзбраення сярэднявечных беларускіх зямель з'яўляўся Ю. М. Бохан [3–4; 6–11; 23; 39].

І. У. Слюнькова, У. А. Чантурыя і Ю. У. Чантурыя, разглядаючы гісторыю горадабудаўніцтва Верхняга Падняпроўя і Беларусі цалкам, звярталі ўвагу і на Быхаў. На падставе пісьмовых крыніц і горадабудаўнічых планаў даследчыкі прааналізавалі эвалюцыю гарадской забудовы, а таксама засяродзілі ўвагу і на прычынах, якія паўплывалі на змены ў гарадской планіроўцы на ўсіх стадыях існавання гарадоў як у эвалюцыйным, так і ў палітычным сэнсе [43; 47–49].

Пытаннямі горадабудаўніцтва Быхава ў агульнабеларускім кантэксце займаецца М. А. Волкаў [10–11]. Ён першым сярод сучасных спецыялістаў выказаў думку пра магчымасць існавання ў Быхаве адначасова двух замкаў у XV–XVI стст. [10].

Праблему развіцця бастыённай фартыфікацыі магілёўскага Падняпроўя вывучаў беларускі археолаг І. У. Спірын. Вынікам яго-ных даследаванняў стала яго дысертацыйнае даследаванне [43].

Бліскучы беларускі нумізмат В. Н. Рабцэвіч у сваіх даследаваннях апісаў і атрыбутаваў скарбы і адзінкавыя знаходкі манет, знойдзеныя на тэрыторыі горада Быхава [37–38].

Звесткі пра матэрыяльную культуру і палітычную гісторыю Быхава (гандаль, рамесніцтва і гарадскую забудову, баявыя дзеянні і іх вынікі) змяшчаюцца ў шэрагу манаграфій і даследаванняў, прысвечаных вайсковым канфліктам XVI–XVIII стст. [1–4; 16; 23–24; 39; 44–45; 50].

Калі звярнуцца да археалогіі, то першыя пошукавыя працы здзяйсняліся на Быхаўшчыне яшчэ ў XIX ст. У рэгіёне працавалі такія археолагі, як Ф. Я. Нарбут, Н. М. Турбін, Е. Р. Раманаў, С. С. Шутаў, І. А. Сербаў, М. В. Фурсаў і С. Ю. Чалоўскі. Найбольш поўным даследаваннем па ўліку і сістэматызацыі археалагічных помнікаў і аб'ектаў Быхава з'яўляюцца працы В. Ф. Капыціна [27–28].

Звесткі пра археалагічныя аб'екты ў межах горада былі перанесены ў "Дзяржаўны спіс гісторыка-культурный спадчыны Рэспублікі Беларусь" [17].

Непасрэдна археалагічныя работы ў межах сучаснага Быхава выконваліся з 1970-х гг. Гэта былі разведкі помнікаў жалезнага веку і Сярэднявечча (Л. Д. Побаль, Я. Р. Рыер і І. І. Сінчук) [34–36; 40–41].

Разглядаючы археалогію Быхава, трэба адзначыць паўнавартасны аналіз быхаўскай кафлі, выкананы Н. П. Шутковай [51]. Аналіз побытавай керамікі і некаторых ювелірных вырабаў з тэрыторыі замка – М. А. Іванковіч [21–22]. Зараз над вывучэннем археалогіі Быхава працуюць І. А. Марзалюк [30–31] і Р. Д. Галынскі [12–15].

Такім чынам, мы бачым, што гістарыяграфія Быхава па ўказанай праблеме падзяляецца на тры храналагічныя перыяды, якія адрозніваюцца колькасцю і якасцю навуковых метадаў даследавання:

1. Першыя публікацыі, якія пабачылі свет да сярэдзіны XX ст., насілі кампілятыўны і фрагментарны характар.
2. Даследаванні агульнагістарычнага характару і першыя археалагічныя даследаванні на тэрыторыі горада Быхава праводзяцца з 1960-х гг.
3. Паўнавартаснае гістарычнае і археалагічнае вывучэнне тэрыторыі горада пачалося толькі ў канцы XX ст.

**Літаратура**


1. Абецедарский, Л. С. Белоруссия и Россия : очерки русско-белорусских связей второй половины XVI–XVII вв. / Л. С. Абецедарский. – Минск : Высш. шк., 1978. – 256 с.
2. Абецедарский, Л. С. Белорусы в Москве XVII в. : из истории белорусско-русских связей / Л. С. Абецедарский. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1957. – 62 с.
3. Бабятынскі, К. Ад Смаленску да Вільні. Вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй (1654–1655 гг.) / К. Бабятынскі // ARCHE. – 2008. – № 7–8 (70–71). – С. 188–365.
4. Бабятынскі, К. Падняпроўскія крэпасці ў сістэме абароны ўсходняй мяжы Вялікага Княства Літоўскага : XVI – палова XVII стагоддзя / К. Бабятынскі // ARCHE. – 2014. – № 12. – С. 290–304.
5. Без-Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии, с присовокуплением и других сведений, к ней же относящимся / М. О. Без-Корнилович ; подгот. изд. В. Н. Татур. – [Репринт. изд.]. – Минск : ООО «Алфавит», 1995. – VII, 335 с.
6. Бохан, Ю. М. Города, местечки и замки Великого княжества Литовского : энцикл. / ред совет: Т. В. Белова (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 312 с.
7. Бохан, Ю. М. Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385–1576 / Ю. М. Бохан. – Мінск : Беларусь, 2003. – 88 с.
8. Бохан, Ю. М. Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI стст. / Ю. М. Бохан. – Мінск : Экаперспектыва, 2002. – 336 с.
9. Бохан, Ю. М. Узбраенне насельніцтва беларускіх земляў у XIV–XVI стагоддзях / Ю. М. Бохан. – Мінск : Беларусь, 2012. – 151 с.
10. Волкаў, М. А. Быхаў у першай палове XVII ст. / М. А. Волкаў // Сапегі: асобы, кар'еры, маёнткі : зб. навук. арт. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2018. – С. 167–194.
11. Волкаў, М. А. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. / М. А. Волкаў // Беларус. гіст. час. – 2013. – № 5. – С. 16–24.
12. Галынскі, Р. Д. Горад Быхаў у XIV–XVIII стст. (узнікненне, развіццё, эканоміка, вайсковая справа і роля ў рэгіёне) / Р. Дз. Галынскі // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2020. – № 9. – С. 28–36.
13. Галынскі, Р. Дз. Справаздача аб археалагічным наглядзе на аб'екце «Строительство сетей теплоснабжения к зданию прихода храма Святой Живоначальной Троицы г. Быхова» ў 2013 г. : дамова Ін-та гіст. НАН Беларусі з настаяцелем храма Святой Жываначальнай Тройцы г. Быхава ад 26 снежня 2013 г. / Р. Дз. Галынскі // ЦНА НАН Беларуси. ФАНД. – Арх. № 3156.
14. Галынскі, Р. Дз. Справаздача аб археалагічным наглядзе на аб'екце «Текущий ремонт водопроводной сети по адресу г. Быхов, ул. Советская, 2» у г. Быхаве Магілёўскай вобласці : дамова Ін-та Гісторыі НАН Беларусі з Быхаўскім раённым спажывецкім таварыствам г. Быхава ад 19 чэрвеня 2015 г.) / Р. Дз. Галынскі // ЦНА НАН Беларуси. ФАНД. – Арх. № 3755.
15. Галынскі, Р. Дз. Справаздача аб археалагічных разведках і раскопках у гістарычным цэнтры г. Быхава Магілёўскай вобласці ў 2013 г. Магілёў, 2014 г. / Р. Дз. Галынскі // ЦНА НАН Беларуси. ФАНД. – Арх. № 3155.
16. Грицкевич, А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. / А. П. Грицкевич. – Минск : Наука и техника, 1975. – 248 с.
17. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад.: В. Я. Абламскі, І. М. Чарняўскі, Ю. А. Барысюк. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 684 с.
18. Живописная Россия / под. общ. ред. П. П. Семенова. – Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – 2-е изд. – Минск : Беларус. энцыкл., 1994. – 490, VI с., 24 л.
19. Жижиян, С. Ф. 101 занимательный факт из истории Быховщины / С. Жижиян. – Могилев : АмелияПринт, 2013. – 84 с.
20. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : Магілёўская вобласць / АН БССР ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш]. – Мінск : Беларус. савец. энцыкл., 1986. – 407 с.
21. Иванкович, М. А. Бытовая кермика из раскопок на территории Быховского замка / М. А. Иванкович // Романовские чтения – 10, посвящ. 80-летию со дня основания ист. фак-та : сб. ст. Междунар. науч. конф., Могилев, 27–28 нояб. 2014 г. / редкол.: И. В. Шардыко [и др.]. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2015. – С. 234–236.
22. Иванкович, М. А. Распространение культа Никиты Бесогона на территории Могилевского Поднепровья и Посожья (по данным археологических источников) / М. А. Иванкович // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зб. навук. пр. удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф. / уклад.: А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2015. – С. 19–25.
23. Касажэцкі, К. Кампанія 1660 году ў Літве / К. Касажэцкі // ARCHE. – 2006. – № 6. – С. 81–408.
24. Катлярчук, А. У ценю Польшчы і Расеі / А. Катлярчук // ARCHE. – 2008. – № 7–8. – С. 336–667.
25. Конисский, Г. История русов или Малой России / Г. Конисский. – М. : Университет. тип., 1846. – 261 с.
26. Копысский, З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З. Ю. Копысский. – Минск : Наука и техника, 1966. – 227 с.
27. Копытин, В. Ф. Археологические памятники Быховского района Могилевской области / В. Ф. Копытин. – Могилев : Изд-во МГУ им. А. А. Кулешова, 1995. – 252 с.
28. Копытин, В. Ф. Свод памятников археологии чернобыльской зоны / В. Ф. Копытин. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 1998. – 241 с.
29. Мальцев, А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века / А. Н. Мальцев. – М. : Изд-во Москов. ун-та, 1974. – 256 с.
30. Марзалюк, І. А. Отчет об археологических разведках на территории Быховского замка в 2011 г. / І. А. Марзалюк. – [Рукапіс].
31. Марзалюк, І. А. Справаздача аб археалагічных раскопках на тэрыторыі замка ў г. Быхаве Магілёўскай вобласці ў 2013 г. / І. А. Марзалюк. – 354 с. – [Рукапіс].
32. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях : в 3 кн. / сост. [с предисл.] и под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилев : Тип. Губерн. правл., 1882. – Кн. 2. – 783 с.




Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

33. Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Быхаўскага раёна / Беларус. Сав. Энцыкл. ; І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. А. М. Хількевіч. – Мінск : БелСЭ, 1990. – 576., [8] л. іл. : іл.
34. Поболь, Л. Д. Славянские древности Белоруссии : (свод археологических памятников раннего этапа зарубинецкой культуры – с середины III в. до н.э. по начало II в н.э.) / Л. Д. Поболь ; ред. Ю. В. Кухаренко. – Минск : Наука и техника, 1974. – С. 214–215.
36. Риер, Я. Г. Археология средневековой европейской деревни: общие черты и региональные особенности : курс лекций / Я. Г. Риер. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2008. – 112 с.
36. Риер, Я. Г. Сельское общество Могилевского Поднепровья X–XIII вв. По археологическим данным : моногр. / Я. Г. Риер. – Могилев : УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2010. – 176 с.
37. Рябцевич, В. Н. О чем рассказывают монеты / В. Н. Рябцевич ; под. ред. А. П. Игнатенко. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск : Нар. асвета, 1978. – 254 с.
38. Рябцевич, Д. Монеты России в кладах XVII в. на территории Могилёвщины / Д. Рябцевич // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва : зб. навук. пр. / уклад. І. А. Пушкін. – Магілёў : УПКП «Магілёўск. абл. ўзбуйнёная друк.», 2001. – С. 71–74.
39. Сагановіч, Г. Невядомая вайна: 1654–1667 / Г. Сагановіч. – Мінск : Наука і тэхніка, 1995. – 144 с.
40. Синчук, И. И. Крученые ручки кувшинов 17 в. (Могилев) / И. И. Синчук // Магілёўшчына. – Магілёў : Магілеўск. абл. краязнаўч. музей імя Е. Р. Раманава, 1994. – Вып.V. – С. 26–27.
41. Сінчук, І. І. Быхаў / І. І. Сінчук // Археалогія Беларусі : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1 : А–К. – С. 134.
42. Слюнькова, И. Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. / И. Н. Слюнькова. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 144 с. : ил.
43. Спирин, И. В. Формирование и развитие системы оборонительных сооружений Оршанско-Могилевского Поднепровья в XII–XVIII вв. (по археологическим данным) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.06 / И. В. Спирин ; НАН Беларуси. – Минск, 2016. – 26 с.
44. Ткачев, М. А. Замки Белоруссии / М. А. Ткачев. – Минск : Полымя, 1987. – 222 с. : ил.
45. Ткачоў, М. А. Замкі і людзі / М. А. Ткачоў ; пад рэд. Г. В. Штыхава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 184 с.
46. Топографические примечания на знатнейшие места путешествия Ее Императорского Величества в Белорусские наместничества. – СПб. : Импер. акад. наук, 1780. – 133 с.
47. Чантурия, В. А. Архитектурные памятники Белоруссии / В. А. Чантурия. – Минск : Полымя, 1982. – 223 с. :
48. Чантурия, В. А. Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / А. В. Чантурия. – Минск : Полымя, 1986. – 240 с.
49. Чантурия, Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: средневековое наследие, Ренессанс, барокко, классицизм / Ю. В. Чантурия. – Минск : Белорус. наука, 2005. – 375 с.
50. Шкапляроў, Ю. П. Старабыхаўская крэпасць у XVII ст.: архітэктура і арганізацыя абароны / Ю.П. Шкапляроў, Р.Д. Галынскі // Ідэальны горад-крэпасць. Ваенная гісторыя Старога Быхава ў XVII стагоддзі : манаграфія / Ю. П. Шкапляроў, М. А. Волкаў, Р. Д. Галынскі; пад навук. рэд. доктара гістарычных навук, прафесара І. А. Марзалюка. – Магілёў : Магілёўскі інстытут МУС, 2018. – С. 33–80.
51. Шуткова, Н. П. Стенные печные изразцы Быховского замка по материалам археологических раскопок 2013 г. / Н. П. Шуткова // Быховские краеведческие чтения – V : сб. ст. регионал. науч.-исслед. конф. – Могилев : ГУК «Быхов. район. ист.-краевед. музей, 2016. – С. 20–23.
52. Baliński, M. Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym opisana / M. Baliński. – Warszawa, 1846. – T. 3. – 906 s.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова